ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 112 (1079) | ПЯТНІЦА, 16-га мая 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

АБ ОРГАНІЗАЦЫІ ХЛЕБАЗАГАТОВАК У 1930-31 ГОДЗЕ

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

Аграмаджаны сэктар сельскай гаспадаркі шпарка расьце. Саўгасы пашыраюцца і ўмацніюцца. Масавая колектывізацыя ахапіла асноўныя збожжавыя раёны, збожжавыя пасевы амаль цалкам кантрактуюцца.

У сувязі з гэтым—Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляе організаваць хлебазагатоўкі ў 1930-31 годзе на наступных падставах:

1. Адзіным загатаўшчыкам хлеба зьяўляецца хлебная кооперацыя.

2. Хлебацэнтр павінен быць пераўтвораны ва ўсесаюзны цэнтр хлебнай кооперацыі. Узаемаадносіны яго з рэспубліканскімі цэнтрамі хлебнай кооперацыі павінны быць пабудаваны таксама, як узаемаадносіны Цэнтрасаюзу Саюзу ССР з рэспубліканскімі цэнтрамі спажывецкай кооперацыі.

3. Для ўмацненьня хлебнай кооперацыі спажывецкая кооперацыя і Саюзхлеб павінны перадаць ёй свой тэхнічны апарат і складзкую гаспадарку, прызначаную для захаваньня хлеба ў глыбінных пунктах, а таксама спэцыяльныя кадры загатоўчага апарату.

4. Саюзхлеб згрупоўвае ў сябе ўвесь загатаўляемы хлеб і распараджаецца ім.

Хлебная кооперацыя, на падставе дагавору з Саюзхлебам, здае яму ўвесь загатаўляемы ёю хлеб. Асноўныя ўмовы гэтага дагавору ўстанаўліваюцца Народным Камісарыятам Замежнага і Ўнутранога Гандлю СССР. У гэтым дагаворы хлебнай кооперацыяй павінна быць забясьпечана пакрыцьцё гандлёвых і накладных выдаткаў па хлебазагатоўках, выдаткаў па тэхнічнаму абслугоўваньню пры контрактацыі хлеба, а таксама нармальныя капітала-зьберажэньні. Акрамя таго, у дагаворы павінен быць прадугледжан удзел хлебнай кооперацыі ў прыбытках Саюзхлеба. Саўгасы здаюць хлеб непасрэдна Саюзхлебу.

Саюзхлеб зьбірае гарнцавы збор па ўсім Саюзе ССР.

5. У сувязі з тым, што ўвесь загатаўляемы хлеб паступае ў Саюзхлеб, у яго павінны быць згрупаваны ўсе прыстанскія і прыстанцыйныя хлебныя склады і элеватары, а таксама і таварныя млыны. У тых прыстанскіх і прыстанцыйных складах, якія зьяўляюцца адначасова і пунктамі ссыпкі хлеба, прыёмка хлеба ад сялян і колгасаў і расплата за хлеб вытвараецца сельска-гаспадарчай кооперацыяй. Яна там-жа безадкладна перадае гэты хлеб Саюзхлебу.

6. Для сталай узаемнай асьвядомленасьці Саюзхлеба і хлебнай кооперацыі аб загатоўках і рэалізацыі хлеба і для моцнага супрацоўніцтва паміж імі прызнаць мэтазгодным удзел прадстаўнікоў хлебнай кооперацыі ў органах кіраўніцтва Саюзхлебам ад яго праўленьня да раённых кантор, а таксама ўдзел працаўнікоў Саюзхлеба ў праўленьнях саюзаў хлебнай кооперацыі.

Праўленьню Хлебацэнтра даручаецца прыняць захады да таго, каб формы гэтага ўдзелу былі абгавораны і ўстаноўлены на бліжэйшых сходах упаўнаважаных саюзаў хлебнай кооперацыі, альбо на бліжэйшых сэсіях саветаў гэтых саюзаў з прыцягненьнем да абгаварэньня гэтага пытаньня прадстаўнікоў Саюзхлеба.

7. Побач з загатоўкай таварнага хлеба, на хлебную кооперацыю ўскладаецца збор насенных і страхавых фондаў. Хлебная кооперацыя абавязана ў тэрміновым парадку падрыхтавацца да таго, каб безадкладна па рэалізацыі ўраджаю сабраць у аграмаджаным сьвірны ўсе насенныя і страхавыя фонды.

Насенныя фонды павінны быць сабраны ў такім памеры, каб цалкам забясьпечыць насеньнем пашырэньне азімых і ярavых пасеўных плошчаў у 1930-31 годзе, якое вызначана ў кантрольных лічбах.

Народнаму Камісарыяту Земляробства СССР даручаецца ў месячны тэрмін распрацаваць падрыхтоўчыя меры, неабходныя для збору і захаваньня насенных фондаў будучага году.

8. Забясьпечаньне хлебам насельніцтва ўскладаецца на спажывецкую кооперацыю. У сувязі з гэтым, лабазны гандаль Саюзхлебу павінен быць спынен, а яго лабазная сетка перадана спажывецкай кооперацыі.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР
А. І. РЫКАЎ.

Справавод Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і Савету працы і абароны
Н. ГАРБУНОЎ.

Масква, Крэмль, 6-га мая 1930 г.

УСІМ АК І РК ЛКСМБ

Друкуецца і гэтымі днямі выходзіць масавым тыражом брошурка пад рэдакцыяй Вясковага аддзелу ЦК ЛКСМБ „Комсамол,—за сілос!" У зьвязку з пастановаю ЦК ЛКСМБ аб тым, што кожная комсамольская ячэйка павінна організаваць 30 сілосных ям, трэба дабіцца таго, каб кожны вясковы комсамолец меў брошурку: „Комсамол,—за сілос!", якая ў кароткіх рысах растлумачвае значэньне сілосу, тэхніку сіласаваньня, задачы, якія стаяць перад кожнай комсамольскай ячэйкай у гэтай галіне.

У мэтах своечасовага забясьпечаньня організацый літаратурай аб сілосаваньні, ЦК ЛКСМБ прапануе ўсім Акругкомам і Райкомам комсамолу дасылаць у Белдзяржвыдавецтва (Менск, Савецкая, 63) папярэднія заказы на „Комсамол,—за сілос!".

ЦК ЛКСМБ.

Закрыўся Пленум ЦК ЛКСМБ

З 11-га па 14-ае мая адбыўся чарговы пленум ЦК ЛКСМБ, які абмеркаваў наступныя пытаньні:

1. Даклад сакратара ЦК ЛКСМБ тав. **Палякова** аб ходзе выкананьня пастаноў ЦК КП(б)Б і ЦК УсеЛКСМ.

2. Даклад намесьніка старшыні Дзяржпляну БССР тав. **Гольдштэйна** і садаклад АППАД ЦК ЛКСМБ тав. **Шоламава** аб падрыхтоўцы кадраў і ўдзеле КСМ.

3. Даклад вайсковага работніка ЦК ЛКСМБ тав. **Ільлічова** і садаклад тав. **Лева** аб стане вайскова-фізкультурнай работы.

Пленум зацьвердзіў пастанову бюро ЦК ЛКСМБ і пастанову пленуму Мен. АК ЛКСМБ аб вызваленьні ад абавязкаў сакратара Мен. АК ЛКСМБ і члена бюро ЦК тав. **Маслоўскага** і ўвёў у склад ЦК і бюро тав. **Гайдукевіча**.

Пленум вызваліў ад абавязкаў члена рэдколегіі „Чырвонай Зьмены" тав. **Саковіча** і абраў членам рэдколегіі тав. **Дамарацкага**.

Бурныя жаночыя дэманстрацыі ў Лодзі

Крывавыя сутычкі паліцыі з дэманстрантамі

ВАРШАВА, 14. У Лодзі адбылася дэманстрацыя беспрацоўных жанчын, якія прад'явілі магістрату патрабаваньне адкрыць грамадзкія работы. Калі чыноўнікі магістрату заявілі, што работы няма, дэманстранты ўварваліся ў памяшканьне магістрату і пачалі граміць канцэлярыю. Моцны атрад паліцыі выгнаў рабочых ад памяшканьня магістрату.

У Радоме беспрацоўныя дэманстранты занялі памяшканьне біржы працы, супроць беспрацоўных выступіла паліцыя. Пры сутычцы некалькі дэманстрантаў ранена.

Прамысловасьць у Токіё скарачаецца

Рабочыя сотнямі выкідваюцца на вуліцу

ТОКІЕ, 14. У выніку зачыненьня 945 дробных фабрык у адным толькі Токіё у працягу красавіка засталося без працы 20 т. рабочых. Дробныя ўласьнікі, не маючы сродкаў выплаціць рабочым зарплаты, хаваюцца і прадпрыемствы часова ўпраўляюцца рабочымі.

1712000 беспрацоўных у Англіі

ЛЁНДАН, 14. На 5 мая у Англіі афіцыйна зарэгістравана 1712000 беспрацоўных, на 233 тысячы больш чымся ў пачатку гэтага году.

Паўстанцкія арміі Індыі пераходзяць у наступленьне

Баі ў Шалапуры ня спыняюцца. Паўстанцы наступаюць на Пэшавар

ЛЁНДАН, 13. Паўстанцкі рух у Індыі ня толькі ня ўціхае, але наадварот, разгортваецца з новай сілай. Горад Шалапур (у Бамбейскай провінцыі) ізноў быў захоплен паўстанцамі. Англа-індыйскія войскі падпарадкаваюцца бесьперапынным нападам. На паўночнай ваколіцы Індыі (пагранічны з Афганістанам і СССР) паўстала племя Турангзай. Паўстанцы рухаюцца на Пэшавар (буйнейшы горад на поўначы Індыі). Англа-індыйская ўлада апублікавала афіцыйнае паведамленьне аб прадстаючых вайсковых дзеяньнях у гэтым раёне.

РЫГА, 13. Латвійская газэта „Рыгас Рунас" паведамляе цікавыя весткі аб складзе індыйскай арміі. Колькасьць арміі—270 тыс. чал. Акрамя таго, ўлада ў Індыі налічвае вялікую паліцэйскую армію (да паловы мільёну чал.). Усе камандныя пасады ў арміі знаходзяцца ў руках англічан. На паўночнай ваколіцы Індыі згрупавана буйная армія ўсіх родаў зброі.

ЛЁНДАН, 14. У Шалапуры вайсковае становішча праводзіцца з усёй суровасьцю. Арыштаваны сотні людзей. У сувязі з гэтым жыхары пачалі ўцякаць з гораду. У горадзе сконцэнтравана 1800 чалавек ангельскай пяхоты. Грузавікі, перапоўненыя войскамі, патрулююць па вуліцах.

Саюз чырвоных франтавікоў жыве...

6 мая 1929 году быў, па распараджэньню міністра ўнутраных спраў соцыял-фашыстага Зэвэрынга, забаронен саюз Чырвоных франтавікоў. Ва ўсіх рабочых кварталах адбыліся выключныя па баявому духу дэманстрацыі супроць забароненьня.

Перад памяшканьнем ЦК компартыі на пляцу Бюлова дэманстравала звыш 50 тыс. рабочых і работніц, чырвоных франтавікоў, анты-фашыстых і саюзу юных франтавікоў. Выступалі т. т. Леоэ, Найман і інш.

Саюз Чырвоных франтавікоў быў організаваны ў сярэдзіне Нямеччыны ў 1924 г.



На здымку: мітынг-протэсту.

ТЭМПЫ СЯЎБЫ ПА БССР НЕВЫСТАРЧАЛЬНЫЯ

Засеяна 657.929 гэктараў ці 31,6 проц. пляну

Вялізарнае адставаньне індывідуальнага сэктару ад колгасаў у Гомельскай, Полацкай і Аршанскай акругах

Мобілізуем усе сілы на выкананьне і перавыкананьне пасеўных плянаў

Сёлета сеў па БССР распачаўся значна раней, чым летась. Калі летась масавы сеў у Паўднёвых раёнах (Гомельскай і Мазырскай акругах) пачаўся ў першых лічбах мая, дык сёлета—на 15-20 дзён раней. У першых лічбах мая ў паўднёвых раёнах было засеяна каля 35-40 проц.

Летась у паўночных акругах масавы сеў разгарнуўся толькі 20-га мая, а сёлета ў Полацкай і Віцебскай акругах да масавага севу прыступілі прыблізна 5-8 мая.

Стан пасеву на 10-ае мая характарызуецца ў наступных лічбах:

Усяго па 7 акругах (за выключэньнем Віцебскай)—засеяна 657929 гэктараў альбо 31,6 проц. пляну. З гэтага ліку ў колгасах засеяна—140.041, альбо 34,6 проц. у індывідуальным сэктары засеяна—517.888 альбо—30,8 проц.

У Гомельскай акрузе на 10-ае мая колгасамі засеяна 53,2 проц. пляну.

Куды горш абстаіць справа ў індывідуальным сэктары Гомельскай акругі, дзе засеяна толькі 38, 5 проц. плошчы.

У Мазырскай акрузе колгасамі засеяна 58,2 проц. плошчы, індывідуальным сэктарам—52,7 проц.

У Полацкай акрузе колгасы выканалі заданьне па засеву на 29,8 проц., індывідуальны сэктар засеяў толькі 17 проц.

У Аршанскай акрузе колгасы выканалі плян па засеву на 20 проц., індывідуальны сэктар на—15,4 пр. Колгасы Менскай акругі засеялі 29,8 проц., індывідуальны 27,1 пр. Колгасы Магілеўшчыны засеялі 30,2 проц. плошчы, а індывідуальны сэктар перагнаў колгасы на 4,8 проц., г. зн. засеяў 35,5 проц.

Колгасы Бабруйшчыны выканалі плян на 37,3 проц., індывідуальны сэктар—на 35 проц.

Стан севу ў саўгасах. Саўгасы Насентрэсту на 10-ае мая засеялі 42,4 проц. плошчы, а саўгасы Белсельтрэсту—41,8 проц.

Па ўсіх культурах—за выключэньнем прапашнікаў (тэхнічных і бульбы) колгасны сэктар ідзе ўпераддзе паходу сева і асабліва па засеву траў.

Што-ж датычыцца тэхнічных культур і бульбы, дык колгасы вельмі адстаюць ад індывідуальнага сэктару. Так, напрыклад, колгасамі засеяна толькі 12 проц. тэхнічных культур і бульбы—21,3 пр., а індывідуальным сэктар засеяў тэхнічных культур— 15,9 проц. і бульбы—36 пр.

Адставаньне колгасаў па гэтых культурах назіралася і ў папярэдняй дэкадзе. Такое становішча тлумачыцца тым, што ў асобных мясцох колгасы не жадаюць перайсьці да спэцыялізацыі пасеваў, а таксама і асобных колгасаў з-за адсутнасьці рабочай сілы.

Трэба адзначыць, што ў параўнаньні з папярэдняй дэкадай індывідуальны сэктар вельмі падцягнуўся і зараз мы нагляддаем разыходжаньні. Індывідуальны сэктар адстае ад колгасаў толькі на 3,8 проц.

Але ўсё-ж такі трэба констатаваць, што ў цэасобных акругах сеў па індывідуальных гаспадарках праходзіць вельмі ненармальна. К прыкладу, узяць хоць-бы Гомельскую акругу. Тут індывідуальны сэктар адстаў ад колгасаў на 14,7 проц., у Полацкай акрузе індывідуальны сэктар адстаў ад колгасаў на 12,8 проц., у Аршанскай—на 5,4 проц. і ў Мазырскай—на 5,5 проц.

Такое становішча з севам у індывідуальным сэктары прымушае біць трывогу, што пляновыя меркаваньні, якія вызначаны савецкім урадам, ня будуць выкананы.

Удзельная вага індывідуальнага сэктару ў агульнай плошчы засеву яшчэ невыстарчальная.

Тэрміны для скончаньня сяўбы асабліва ў паўднёвых раёнах, застаюцца вельмі кароткі. Мясцовыя організацыі павінны налегчы на ўсе вагары, прывесьці ў рух усе наяўныя сродкі і на што-б там ні стала дабіцца выкананьня і перавыкананьня намечаных плянаў.

Комсамольскія ячэйкі колгасаў і саўгасаў, організуйце соцыялістычнае спаборніцтва паміж сабою на хутчэйшае скончаньне севу і на перавыкананьне намечаных плянаў па сяўбе.

Ні ў якім разе не павінен усьлізнуць з пункту гледжаньня індывідуальны сэктар.

Тыя саўгасы і колгасы, якія закончылі сеў, павінны перакінуць свае сілы на дапамогу бядняцка-серадняцкім гаспадаркам, якія яшчэ не знаходзяцца ў колгасах.

Гэтую дапамогу ў многіх мясцох чакаюць бядняцка-серадняцкія гаспадаркі. На ўмкненьне кулацтва сарваць сяўбу адкажам поўным выкананьнем і перавыкананьнем намечаных плянаў па сяўбе.

X.

На пленуме ЦК ЛКСМБ

Будаўніцтва соцыялізму

патрабуе новых пролетарскіх кадраў, якія-б забясьпечылі патрэбы соцыялістычнай гаспадаркі

„Спэцыялісты павінен аўладаць выстарчальнымі глыбокімі соцыяльна-тэхнічнымі і эномічнымі ведамі, шыр… кім грамадзка-палітычным сьветапоглядам, якасьцямі, неабходнымі для арганізатараў вытворчай актыўнасьці шырокі… мас працоўных". (З рашэньняў лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б).

(З дакладу загадчыка аддзелу адукацыі і быту ЦК ЛКСМБ т. Шоламава)

Таварышы! Задача майго дакладу—высьвятліць месца комсамолу ў падрыхтоўцы рабочай сілы і спэцыялістых і выказаць прынцыповы пункт погляду комсамолу па пытаньні падрыхтоўкі кадраў спэцыялістых і рабочай сілы.

Воляю рабочай клясы і асноўнай масы сялянства тэмпы нашага будаўніцтва ўсё павялічваюцца. Калі, прыкладна, узяць валавую продукцыю па першаму варыянту пяцігодкі рэспубліканскай прамысловасьці, дык яна павінна была складаць 600 тысяч рублёў, зараз-жа, па новаму варыянту, яна будзе складаць 1,350 тыс. руб.

Мы перабудоўваем Беларусь аграрную ў Беларусь аграрна-індустрыяльную. Новая соцыяльная экономіка, культура і быт дашлі да самых далёкіх вёсак нашага Палесься.

Пры такіх шпаркіх тэмпах пытаньне кадраў набывае асаблівае значэньне. У нас часта недаацэньваюць значэньня і важнасьці проблемы кадраў. Асабліва гэта датычыцца комсамольскай організацыі. Некаторыя разглядаюць падрыхтоўку кадраў як кампанію. Гэта бясспрэчна зьяўляецца глыбокай памылкай. Вырашэньне проблемы кадраў ёсьць вырашэньне часткі клясавай барацьбы і нарэшце—вырашэньне проблемы кадраў—гэта ёсьць барацьба за соцыялістычную культуру. Ва ўмовах Беларусі ў гэтым напрамку мы маем надзвычайна-вялікую адсталасьць.

Я вам, таварышы, прывяду дзьве лічбы: калі ў Нямеччыне процант інжынэрна-тэхнічнай сілы ў адносінах да рабочых складае 1,38 проц., дык у СССР—0,37 проц. і па Беларусі—0,30 проц.

Калі па машына-будаўніцтве ў Нямеччыне процант спэцыялістых да рабочых складае 37,2 проц., дык у СССР—1,12 проц., а у БССР толькі—0,12 проц.

Па металёвай прамысловасьці ў БССР спэцыялістыя з вышэйшай асьветай складаюць толькі 0,1 проц., альбо—0,2 проц.

Гэтыя лічбы з усёй яскравасьцю высоўваюць перад намі пытаньне падрыхтоўкі кадраў спэцыялістых ў адпаведнасьці з тэмпамі росту нашай прамысловасьці і рэконструкцыяй сельскае гаспадаркі.

Пераможам „вузкія месцы"

Калі ўзяць, нават па варыянтах пяцігодкі, што мы можам даць пры ўмовах напружанай прапускной здольнасьці нашых навучальных устаноў, дык гэта выражаецца ў наступным: мы зможам даць па вышэйшай кваліфікацыі—38,3 проц., па сярэдняй адукацыі—35,5 проц.—па Беларусі. Адсюль яскрава паўстае пытаньне: што нам трэба вышукаць яшчэ акрамя навучальных устаноў, якія іншыя формы падрыхтоўкі?

Асноўнай формай далатковай падрыхтоўкі павінна зьявіцца па-за вузаўская сыстэма падрыхтоўкі.

Возьмем, напрыклад, Віцебскі прамысловы цэнтр, дзе шмат рабочых—толькі на прадпрыемствах ахоплены тэхнічнымі курсамі 362 асобы.

У рашэньнях лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) аусім чоткя даецца дырэктыва аб тым, каб зрабіць прадпрыемствы базай для тэхнічнай падрыхтоўкі кадраў рабочых спэцыялістых і г. д. Нам, комсамольскай організацыі Беларусі, трэба праявіць тут надзвычайна-вялікую ініцыятыву, аб'яднаць інжынэрна-тэхнічныя сілы і сумесна з профорганізацыямі выступіць за масавую профтэхасьвету рабочай моладзі і ўсіх рабочых.

Другой формай у сыстэме па-за вузаўскай падрыхтоўкі кадраў павінна зьявіцца завочнае абучэньне, а ў нас да гэтага часу яго недаацэньваюць.

Нам таксама трэба змагацца за адчыненьне вячэрняй вышэйшай тэхнічнай навучальнай установы для пропуску праз яе ў першую чаргу практыкаў, кваліфікаваных рабочых, якім вытворчае навучаньне ня будзе неабходным праходзіць тут, а якім асноўную ўвагу трэба будзе зьвярнуць на тэорытычную падрыхтоўку.

У нас ёсьць вялікія кадры практыкаў, актывістых на нашых вытворчасьцях, ёсьць рацыяналізатары, ударнікі, першае месца з якіх належыць фабзавучу і профшкольцам, якія павінны скласьці вялікія рэзэрвы з рабочай клясы для падрыхтоўкі кадраў спэцыялістых.

Пролетарызацыя—важнейшая задача

Зусім немалаважнае значэньне займае пытаньне крыніц. Адкуль мы будзем браць людзкі матар'ял для нашых навучальных устаноў? Ад гэтага ў значнай ступені залежыць тып таго спэцыялістага, якога мы будзем выпускаць з нашых навучальных устаноў. Праўда, трэба сказаць, што да гэтага часу ў нас ня было сыстэматычнай работы па падрыхтоўцы рабочай і батрацка-бядняцкай моладзі ў вышэйшыя і сярэднія навучальныя установы. Я лічу, што на гэту сыстэму работы трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Пры наяўнасьці некаторых дасягненьняў у ахопе і павялічэньні пролетарскай, партыйнай, комсамольскай праслойкі, мы ўсё-ж ні ў якім разе не павінны на гэтым спыніцца. Соцыяльны склад трэба лічыць яшчэ нездавальняючым, асабліва калі ўлічыць апошнія рашэньні партыі аб тым, каб склад вышэйшых і сярэдніх устаноў давесьці да 70 проц. рабочых, а на рабфаках да 90 проц.

Комплектаваньне гэтага году ставіць перад намі асабліва востра пытаньне аб крыніцах папаўненьня навучальных устаноў. Вы толькі пагляджце: усяго патрэбна будзе прыняць у 1930 г. 20850 чалавек у ВТНУ, Сельска-гаспадарчую Акадэмію, БДУ, Пэдагогічны інстытут, тэхнікумы і г. д. Адкуль ідзе папаўненьне? Рабфакі даюць—200 чалвек, школы—2-ой ступені—250 чал., спэцкурсы—130 чал. і агульна-адукацыйныя—600 чал., школы колгаснай моладзі—580 чал., вячэрнія курсы і школы — 1000 чал. і сямігодкі—13.700 чал. Ці гэта можа быць цярпіма, калі рабфакі і вячэрняя сыстэма займае такое нязначнае месца? Між іншым, я павінен адзначыць, што ў нас зараз ёсьць наогул ня зусім здаровая тэндэнцыя—ёсьць пасобныя спробы ліквідаваць рабфакі. Нам прыдзецца з усёй рашучасьцю асудзіць усе гэтыя спробы. Рабфакі ў сувязі з пашырэньнем сеткі навучальных устаноў у Беларусі павінны будуць заняць больш значнае месца і павінны быць пашыраны (як дзённыя так і вячэрнія).

Далей, таварышы, калі ўзяць другую форму падрыхтоўкі, дык ў гэтым годзе мы праводзім мобілізацыю 1000 комсамольцаў у вышэйшыя тэхнічныя навучальныя ўстановы і тэхнікумы, 50 чалавек піонэр-актыву—у пэдфак. У нас вельмі дрэнна абстаіць пытаньне з мэтодычным і арганізацыйным кіраўніцтвам з боку народнага камісарыяту Асьветы гэтымі курсамі. Нам усе гэтыя пытаньні трэба будзе паставіць як важнейшыя пытаньні па ўдзелу ў будаўніцтве вышэйшай і сярэдняй школы.

Ажыцьцёвім ідэі Маркса і Леніна.

Наш лістападаўскі пленум і ліпеўскі пленум ЦК УсеКП(б) вынесьлі рашэньне аб рэформе вышэйшай і сярэдняй школы. Я пад сярэдняй школай разумею індустрыяльныя і сельскагаспадарчыя тэхнікумы. У чым сэнс рашэньняў ліпеўскага і лістападаўскага пленуму?

Па-першае, увядзеньне вытворчага навучаньня ў школах, вярней кажучы ажыцьцяўленьне ідэй Маркса і Леніна аб злучэньні адукацыі з вытворчай працай.

Па-другое,—перагляд програм і навучальных планаў, выкінуўшы ўсё лішняе і патрэбнае, што яшчэ ёсьць у нашых програмах.

Трэба сказаць, што нашыя спэцыялістыя, якія выходзяць з навучальных ўстаноў не заўсёды былі прыстасаваны да запатрабаваньняў нашай прамысловасьці.

Аб паскораных выпусках трэба сказаць, што гэта азначае хутчэйшую перамогу „вузкіх" месц у справе забясьпечаньня кадрамі!

Якасьць рэформы павінна нам даць такіх спэцыялістых, аб якіх сформулявала ў рашэньнях лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП (б):

— „Спэцыялістыя павінны аўладаць дастатковымі соцыяльна-тэхнічнымі і экономічнымі ведамі, шырокім грамадзкім сьветапоглядам — якасьцямі, неабходнымі для арганізатараў вытворчай актыўнасьці шырокіх мас працоўных".

Між тым, у вытворчым навучаньні мы робім толькі першыя крокі, вельмі часта неразумеючы ўсяго палітычнага сэнсу вытворчага навучаньня і зводзім да амэрыканскай кооператыўнай сыстэмы вытворчага навучаньня, зводзім справу толькі да набываньня вузкіх навыкаў і азнаямленьня студэнтаў з вузкай вытворчасьцю. Адно з нездаровых зьявішчаў у нашым навучаньні адсутнасьць мэтодыкі і сыстэмы навучаньня. Тут таксама неабходна сказаць, што нашыя гаспадарчыя організацыі недаацэньваюць усёе важнасьці вытворчага навучаньня і студэнтаў пасылаемых на практычную работу на прадпрыемствах, скарыстоўваюць на тэхнічнай рабоце. („Бальшавік" Бабруйскі комбінат, „Энэргія").

Трэба сказаць, што нашы ячэйкі навучальных ўстаноў зусім мала аддаюць увагі вытворчаму навучаньню студэнтаў. Бываюць выпадкі, што ячэйкі чамусьці ня лічаць патрэбным умяшацца, а стаяць у баку ад гэтай справы. Камсамольскім ячэйкам, асабліва вузаўскім і тэхнікумаўскім, неабходна ўзяцца за рэформу навучальных устаноў.

Па пытаньню ўдарніцкага руху трэба зазначыць, што ў нашых навучальных установах ён прывіты надзвычайна слаба. Ударніцкі рух, соцспаборніцтва ставяць перад сабою надзвычайна вялікія задачы, каб гэтымі мэтадамі палепшыць становішча навучаньня, паскорыць тэмпы вучобы, якасьць, дапамагчы адстаючым, змагаючыся за высокую працасьціплінy.

Барацьба другогаднікам, поўная ліквідацыя спазьненьняў, прагулаў, максымальнае ўпачыльненьне вучэбнага году, барацьба з рвацтвам, кар'ерызмам, аполітычнасьцю, адарванасьцю ад грамадзкага палітычнага жыцьця, што зьяўляецца спадчынай старой школы і часткова ўзьнікае нанова пад ціскам дробна-буржуазнай стыхіі па-за і ўнутры навучальнай установы,— павінны праводзіцца неўхільна.

Некалькі слоў я хачу сказаць аб задачах комуністычнага выхаваньня ў нашых навучальных установах. З гэтай справай у нашых навучальных установах дрэнавата. Трэба сказаць, што палітычная непісьменнасьць часта даходзіць да вялікіх размераў, апрача таго, што сярод асобных пластоў студэнцтва маюцца нездаровыя процэсы: аполітычнасьць, упадніцкія настроі, захапленьне фокстротамі і інш.

Супроць буржуазных тэндэнцый.

Зараз я пераходжу да наступнага пытаньня,—да пытаньня аб рабочай сіле. Нам за апошнія часы асабліва востра прыходзіцца сустракацца з барацьбой між соцыялістычнымі організацыямі рабочай моладзі і некаторымі буржуазнымі тэндэнцыямі. Ня гледзячы на вельмі вялікую прынцыповую барацьбу, якую мы праводзілі за ФЗВ, мы на гэтым пленуме маем усё-ж такі асобныя тэндэнцыі, аформленыя языком лічбаў ў пяцігодкі, у адносінах рабочых кадраў ВСНГБ. Трэба сказаць, што ня толькі ВСНГБ, але і значная частка іншых ўстаноў і, нажаль, частка нашых адказных работнікаў, бяруць стаўку на іншыя формы падрыхтоўкі рабочай сілы. Вельмі часта нашы комсамольскія ячэйкі праходзяць міма гэтых процэсаў, незмагаючыся і не процістаўляюць гэтай варожай ідэолегіі, а нават асобныя комсамольцы падпадаюць пад гэты ўплыў. Вось чаму справа комуністычнага выхаваньня—зараз адна з галоўных задач.

У сваім дакладзе намесьнік загадчыка дзяржпляну тав. Гольдштэйн рабіў намёк аб тым, што нам прыходзіцца вучыць людзей па некалькі год. Дак мяне зразумела, што ён кідае намёк на ФЗВ і намёк на тое, што праз сыстэму ШП'у можна праводзіць падрыхтоўку рабочай сілы хутчэй. Аднак гэта выступленьне тав. Гольдштэйна з усёй яскравасьцю паказвае, што ня гледзячы на прызнаньне шэрагам рашэньняў, што ФЗВ зьяўляецца і павінна зьяўляцца асноўнай базай, мы усё-ж такі маем тэндэнцыю працягваць старую лінію і буржуазную ідэолегію па сыстэме падрыхтоўкі рабочай сілы. Я не думаю тут спыняцца на пытаньні, што ШП не можа рыхтаваць рабочую сілу для нашага соцыялістычнага будаўніцтва, а толькі выпускае машынальна „калечаных" людзей, якія не могуць быць удзельнікамі будаўніцтва, а зьяўляюцца на прадпрыемстве прыдаткамі да машыны.

Я хачу тут прывесьці дзьве лічбы па пытаньнях падрыхтоўкі кадраў рабочай сілы. Калі мы возьмем лічбы дзьвюх нашых устаноў ВСНГ і Дзяржпляну, дык паміж гэтымі лічбамі маецца вялікае разыходжаньне. Так, па ВСНГ усяго рабочых павінна быць да канца пяцігодкі, г. зн. у 1932-33 годзе 432.072 чал., без будаўніцтва і торфу павінна будзе складаць 227707 чал.

Па Дзяржпляну-ж з будаўніцтвам і торфам—224230 ч.—амаль што на 50 проц. меншая лічба, чым лічба ВСНГ і без будаўніцтва—91700 чал.

Адкуль-жа яны бяруць крыніцы падрыхтоўкі рабочай сілы?

Мы тут маем два пункты погляду: па-першае—уласныя перасоўваньні. ВСНГ прадугледжвае без будаўніцтва 57732 асобы, а з будаўніцтва 78642 асобы. Дзяржплян на гэтыя дзьве лічбы выстаўляе адну лічбу—86422.

На фабзавучах ВСНГ разьлічвае падрыхтаваць 2670 чал. без будаўніцтва, з будаўніцтвам—6247 чал. Варыянт Дзяржпляну—6520 чал. усяго. Профшколы павінны даць 1930 чалавек без будаўніцтва, а з будаўніцтвам—4951 чал., а Дзяржплян прадугледжвае падрыхтоўку 6677 чал.

Далей індывідуальнае вучнёўства: 370 чал. без будаўніцтва, а з будаўніцтвам—4068 чал., Дзяржплян прадугледжвае 5800 чал.

Па ЦІП'у ВСНГ прадугледжвае: без будаўніцтва—41145 чал., а з будаўніцтвам—60635 чал., а Дзяржплян прадугледжвае—60270.

Вы параўнайце! Калі нават мы палічым лічбы Дзяржпляну найбольш рэальнымі, дык фабзавуч будзе даваць 6520 чалавек, а ЦІП будзе даваць 60270 чалавек. Ці зьяўляецца такое становішча дапушчальным? Бясспрэчна, такое становішча не дапушчальна.

Яшчэ горшае становішча з крыніцамі падрыхтоўкі рабочай сілы па шляхтранспарту, які прадугледжвае адчыненьне толькі адная школы ФЗВ, а астатнія рыхтаваць праз курсы і ЦІП.

Мы прапануем у нашым проэкце, каб броня падлеткаў у рэконструкцыйны пэрыод праз ФЗВ займала ня менш 60 проц. у падрыхтоўцы рабочай сілы, як па лініі амортызацыі, так і для новабудуючыхся заводаў. Але мы маем супярэчнасьці па гэтаму пытаньню, з якімі патрэбна рашуча змагацца.

Выцесьнім ЦІП,—будзем змагацца за ФЗВ

Мы ўсямерна ставім задачу, каб ужо зараз максымальна форсаваць будаўніцтва школ фабзавучу, каб максымальным тэмпам выцесьніць ЦІП'ы і іншыя формы падрыхтоўкі рабочай сілы.

Надзвычайна дрэнна стаіць справа з капітальным абсталяваньнем ФЗВ. У гэтым напрамку мы яшчэ маем шэраг супярэчнасьцяй. У гэтым годзе намі ўзьнята пытаньне аб дадатковым водпуску 750 тысяч рублёў для капітальнага будаўніцтва 7 ФЗВ. Але справа цягнецца яшчэ да гэтага часу. ВСНГ напісаў заяўку ў Экапл, а там адказалі, што грошай няма. Зар… таньне намі перанесена ў ЦК… У контрольных лічбах на 30-3… неабходна ў максымальнай с… прадугледжваць будаўніцтва ФЗВ і будвуч школ.

Другое пытаньне, зьвязанае з ф… вучам, гэта аб фабрычна-за… сямігодцы. Студзеньскі набор … паказаў вельмі трывожнае з… мы паставілі задачу—пераве… на базу сямігодкі. Але што ту… спіна: мы маем, што з чацьверта… цы прынята—32,8 проц., а пята… пы 39,9 проц., а шостай—16,6 … і, нарэшце, з сёмай—7,7 проц… зьявішча вельмі трывожна і … абходна паставіць зараз-жа пы… аб ФЗВ, прыцягнуўшы ўвагу … іншых організацый.

Комсамолу неабходна стаць … да ФЗВ. Трэба дабіцца хутчэй… організацыі ўсіх горадзкіх … у фабрычна-гарадзкія з такім … кам, каб гэтымі сямігодкамі … усіх дзяцей рабочых.

Пытаньне аб кадрах інструкт… іншых работнікаў таксама ста… рад намі вельмі востра, бо нам … пае для фабзавучаў інструктар… тароў і інш. Падрыхтоўкай … кадраў неабходна таксама … Мы прапануем організаваць ін… яльны пэдагогічны інстытут.

Яшчэ некалькі слоў аб проф… Адны гавораць, што профшко… віны рыхтаваць рабочую сіл… прамысловасьці наогул, а другі… раць, што яны павінны рыхта… толькі рабочую сілу, але і … тэхнічны пэрсонал, як мэдыка… шэрагу іншых галоўных рабо… адзін з гэтых пунктаў погля… зьяўляецца правільным. Пры … пункце погляду бярэцца стаўка … каб замяніць ФЗВ профшколамі… школы ў сваім будучым … мець мэтавую ўстаноўку—падр… ку рабочай сілы толькі для та… мысловасьці, дзе нельга орган… ФЗВ. Ня можа быць такога с… шча, каб напрыклад Клімавіцкая … школа рыхтавала для заводу … гія" рабочую сілу,—гэта прост… дотычны факт.

Вось чаму мы высоўвам нас… прапановы: перадаць частку … школ, якія абслугоўваюць … кую прамысловасьць—ВСНГ, … нечным выніку профшколы … быць заменены фабзавучам, а … гое,—тэхнікумамі.

Нам зараз неабходна орга… усю працоўную моладзь, ус… мадзкасьць на барацьбу за … вузоры работы, якія ў нас … прамысловасьці, у сельскай га… цы, у культурным будаўніцтве … перанесьці на кадры. Мы ад … прынцыповых пазыцый, у наш… рацьбе за кадры ні ў якім … ні будзем адступаць ні на адзін…

ЛЕПШЫХ КОМСАМОЛЬЦАЎ У ВАЙСКОВЫЯ ШКО…

Прыблізна праз тры месяцы навучальныя ўстановы Савецкага Саюзу прымуць у свае сьцены дзесяткі тысяч новых людзей, з якіх не адну тысячу прымуць у вайсковыя школы.

Тысячы пролетарыяў, колгасьнікаў і іх дзеці заполняць нашы вышэйшыя і сярэднія ўстановы.

З мэтай падрыхтоўкі гэтых людзей, па ўсім Саюзе і ў прыватнасьці па БССР, раскінута цэлая сетка падрыхтоўчых курсаў.

Гэтыя курсы ўтвораны толькі па лініі падрыхтоўкі ў грамадзянскія навучальныя ўстановы, але, на вялікі жаль, гэтых курсаў няма па лініі падрыхтоўкі ў вайсковыя школы.

Сорамна і ня варта гаварыць аб тэй ролі, якую адыгрываюць вайсковыя школы. Падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў для Чырвонай арміі ёсьць адна з галоўных задач.

Якое становішча мы маем з вярбоўкай кандыдатур у вайсковыя школы на сёньнешні дзень?

Трэба з усёй рашучасьцю заявіць, што становішча з вярбоўкай кадраў у вайсковыя школы па цэлым шэрагу акруг БССР праходзіць нездавальняюча. Напрыклад, Магілёўская акруговая вярбовачная камісія адабрала 30 чалавек, Полацкая—стольнікі-ж.

Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што акруговыя камісіі ў многіх мясцох сьпяць, што далей сваіх габінетаў яны ня выйшлі.

Дырэктывы партыйных, … мольскіх і іншых організац… вярбоўцы ў вайсковыя шко… даведзены да прадпрыемс… колгасаў.

Комсамольская організацыя павінна быць крыніцай да… паньня кадраў у навучальны… новы, на сёньнешні дзень … крыніцай (гаворачы аб пайс… школах) не зьяўляецца. … ячэйкі, райкомы і нават ак… мы (віцебскі) камітэты бя… нічаюць. Аб гэтым гавораць … зацьверджаных кандыдата… вайсковыя школы, дзе п… партыйна-комсамольскага пр… род падаўшых і залічаных … датамі ў вайсковыя школы … плаявае таму проценту, які … ноўлен дырэктывамі ЦК Ус… і іншымі організацыямі.

Адгэтуль—безадкладная … комсамольскіх організацы… ступіць да вярбоўкі ў вай… школы рабочай, батрацкай, … нацкай і калгаснай моладзі, … віць спэцыяльныя даклады … дах комсамольскіх ячэек, … батрацкай і бядняцка-серад… моладзі.

Трэба дабіцца таго, каб … нае вакантнае месца бы… менш 5 заяў.

Дырэктыва Цэнтральнага … тэту УсеКП(б) павінна быць … нана.

Сілосныя ямы патрабуюць--кармоў

Пасеў сілосных культур па Беларусі зрываецца. Пляны выкананы толькі на 0,9 проц.

Кіраўнікі Менскага Акрколгассаюзу яшчэ толькі займаюцца ўзгадненьнем пытаньняў. Нярухавасьцю і закаранеласьцю зрываюць справу сілосаваньня

Уключыць ў працу комсамольскіх організацый выкананьне плянаў засеву сілосных культур і сілосаваньня кармоў

[illegible]омсамольцы Паўночнага Каўказу,— ваша слова!

[illegible]омсамол Беларусі павінен падхапіць ініцыятыву комсамолі Украіны

ХАРКАЎ, 10 мая. Цэнтральны Камітэт Комсамолу Украіны вы[illegible]ае ў паход па засеву кукурузы і соі і выклікае на соцспабор[illegible]тва комсамол Паўночнага Каўказу.


Цэнтральны камітэт ЛКСМУ зьвярнуўся да ўсіх комсамольцаў з [illegible]тупнай радыёграмай:

„Устаноўлена катастрафічнае становішча з пасевам кукурузы. Гэтая [illegible] і высока ўраджайная засухаўстойлівая культура, якая зьяўляецца [illegible] для вырашэньня кармовай проблемы, і якая дае сыравіну для [illegible] галін с-г. прамысловасьці, якая рэальна ўдасканальвае харча[illegible] мас, павінна быць асабліва блізкай комсамолу. На жаль, тры[illegible] аб зрыве кукурузнай кампаніі забіў не комсамол.

Сёньня спэцыяльным распараджэньнем т. т. Косіора і Чубара [illegible] акруговых організацый кідаецца на ліквідацыю ганебнага пра[illegible] ў нашай шырока - разгорнутай вясеньняй пасеўнай кампаніі. [illegible] і ўрад прадпісваюць у 10 дзён неўпасьцю закончыць сеў [illegible]рузы.

Вясеньні пасеўны плян не будзе лічыцца выкананым, без выка[illegible] пляну кукурузы. Сёньня Украіна ідзе першай да вялікай баль[illegible] вясны. Мы не можам дапусьціць, каб у апошнія дні сяўбы [illegible] зрыў пляну засеву кукурузы, а ў некаторых раёнах і нават соі, [illegible] нашае соцыялістычнае першынство. Цэнтральны камітэт ком[illegible] Украіны патрабуе ад комсамольскіх організацый прарвацца [illegible] у рашучым наступленьні за кукурузу. Абвясьцеце пасеўшчыкаў [illegible] выключным значэньні кукурузы і ільготах пры яе пасеве. Асаблі[illegible] ўвагу зьвярнеце на пасеў кукурузы, на сілос. Лепшых комса[illegible] —на горшыя вучасткі. 10-ці дзён у нашай краіне хапала не [illegible] такіх рашаючых баёў. Выкананьне давесьці да 100 процантаў [illegible]. Комсамольцы паўночнага Каўказу! Мы абавязуемся кукурузе і [illegible] больш большую падтрымку, чым вы!—Ваша справа!

З „Комсамольскай Праўды“



Колгасьнікі на сяўбе

МЕНСКІ АКРКОЛГАССАЮЗ СЬВЯДОМА ЗРЫВАЕ СІЛОСАВАНЬНЕ ПА АКРУЗЕ

Кампанія па сілосаваньню зьяўляецца аднэй з важнейшых гаспадарча-політычных кампаній. Аднак у Менскім Акрколгассаюзе ня так глядзяць на яе. Акрколгассаюз цураецца кампаніі сілосаваньня. Да гэтага часу ніякіх практычных мерапрыемстваў ня прыняў. Райколгассаюзы не ўзварушаны. Крэдытаў на організацыю сілоснай працы яшчэ ня вызначана.

Калі юнкораўская брыгада запыталася ў старшыні Акрколгассаюзу: „Чаму Колгассаюз правальвае адну з важнейшых гаспадарча-політычных кампаній“, старшыня Акрколгассаюзу адказаў: — „Бачыце старыя колгасы заняты сваімі справамі, а організаваныя ў гэтым годзе колгасы заняты гаспадарчым будаўніцтвам. Ім патрэбны двары для быдла, хлявы і іншае, дык калі мы нават і дамо практычныя заданьні, дык усё-роўна яны іх ня выканаюць“.

Так ганебна МЕНСКІ АКРКОЛГАССАЮЗ ЗРЫВАЕ СПРАВУ СІЛОСАВАНЬНЯ ПА КОЛГАСАХ МЕНСКАЙ АКРУГІ.

Нават прыгарадныя колгасы, якія ўзімку заўжды больш спажываюць кармоў, нічога ня робяць па іх сілосаваньню. Возьмем, напрыклад, колгас імя Дзяржынскага. „Колгас знаходзіцца ў некалькіх кроках ад Менску. Адзін з найбольш моцных экономічных колгасаў. Аднак, там ніякага ўяўленьня ня маюць аб важнасьці кампаніі па сілосаваньню. Кіраўнікі колгасу толькі чулі аб сілосаваньні, але прапусьцілі гэта міма вушэй і нічога ня робяць.

У совгасе „Вязынь-Фаніполь“ па пляну Белсельтрэсту вызначана пабудаваць 2 сілосныя башты. Аднак, савгас не засявае патрэбных для сілосаваньня культур. Для пабудовы сілосных баштаў няма матэр'ялу і ні сельбуд, ні кіраўніцтва совгасу фактычна да яе ня прыступіла.

Усе чакаюць дырэктыў. А сілосаваньне пад пагрозай зрыву. Мы сёньня сыгналізуем аб гэтым. Патрабуем ад адпаведных органаў тэрміновага прыцягненьня да адказнасьці за зрыў гаспадарча - політычных мерапрыемстваў.

Кампаніяй па сілосаваньню павінны зацікавіцца ўсе грамадзкія організацыі. Яна патрабуе рашучага павароту ўсіх установаў да сілосаваньня.

БРЫГАДЗІР „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“.

Возьмем прыклад з комсамолу Украіны

Організуем паход комсамолу БССР за пасеў кукурузы і сланэчніка

Выклік украінскім комсамолам комсамолу Паўночнага Каўказу на соцспаборніцтва ў праведзеньні паходу за пасеў кукурузы і соі павінен быць падтрыман і Беларускай організацыяй.

Комсамольская організацыя Беларусі, якая ўзяла на сябе абавязак зарыхтаваць 2 мільёны тон сілосных кармоў, ня зможа выканаць задачы, калі ня будзе зьліквідаваны прарыў засеву сілосных культур (кукурузы, сланэчніка).

Па БССР заданьне па засеву сілосных культур выканана толькі на 0,9 проц.

Налётам юнкораўскай брыгады на Наркомзем, Колгасцэнтр, Малжыўсаюз і Менскі Акрколгассаюз выяўлена нерухомасьць, безадказнасьць з боку шэрагу кіруючых працаўнікоў у разьвіцьці справы сілосаваньня і забясьпечаньня пасеву патрэбнай колькасьці сілосных культур.

Задача комсамольскай організацыі —забясьпечыць выкананьне плянаў пасеву сілосных культур, без якіх мы ня выканаем ўзятай намі задачы сілосаваньня.

Камітэты і комсамольскія ячэйкі павінны зараз разгарнуць працу ў колгасах і саўгасах за разьвіцьцё сілосных культур, вядучы рашучую барацьбу з тымі кіраўнікамі, якія супраціўляюцца пасеву сілосных культур, зрываючы гэтым справу сілосаваньня кармоў, з адсюль—перашкаджаюць пасьпяховаму вырашэньню проблемы жывёлагадоўлі ў БССС.

Атрады „Лёгкай Кавалерыі“, юнкоры і сьцянкоры павінны праз друк разгарнуць шырокую праверачную кампанію, што робяць райвыканкомы, райколгассаюзы, сельсаветы, саўгасы, колгасы і індывідуальны сэктар па выкананьню ўрадавага заданьня засеву сілосных культур і разьвіцьця справы сілосавальных кармоў.

Непаслабляючы ўвагі і практычнага ўдзелу ў выкананьні плянаў засеву збожжавых культур, мы павінны па прыкладу комсамолу Украіны разгарнуць шырокі паход комсамолу Беларусі на дапамогу кукурузе і сланэчніку, забясьпечыўшы выкананьне плянаў іх засеву. Мы павінны мобілізаваць усю пролетарскую грамадзкасьць на барацьбу за засеў сілосных культур, на барацьбу за сілосаваньне кармоў.

АСНОВЫ БУДУЧАЙ ХЛЕБАЗАГАТОЎЧАЙ КАМПАНІІ

[illegible] ў сучасны момант [illegible] яшчэ [illegible] закончаны і галоўная ўвага [illegible] быць цяпер згуртавана на [illegible], каб як мага лепш правесьці [illegible] кампанію, тым ня менш, [illegible] ужо неабходна паставіць пы[illegible] аб пачатках, на якіх будзем [illegible] надыходзячую хлебазаго[illegible] кампанію. Акрамя таго, трэ[illegible] на ўвазе, што да хлеба[illegible] кампаніі застаецца ўся[illegible] толькі два з паловай месяцы і [illegible] час ужо сур'ёзна падумаць аб [illegible]ўках, галоўным чынам з бо[illegible] іх забясьпячэньня ўсімі тымі [illegible]ізацыйнымі мерапрыемствамі і [illegible]ным абсталяваньнем, якія [illegible] для таго, каб у кароткі [illegible] прыняць вялізарную коль[illegible] хлеба.

[illegible]адача будучай загатоўчай кам[illegible], як і ў мінулым годзе, будзе за[illegible]цца ў тым, каб правесьці [illegible]загатоўкі ў найкарацей[illegible] тэрмін. У мінулым годзе для [illegible] каго было незразумела, чаму [illegible] паставіла задачу скончыць [illegible]загатоўкі да студзеня.

У мінулым годзе пасеўная кам[illegible], як вядома, вымагала асаблі[illegible] напружаньня сіл, бо ніколі [illegible] напал севу не разгортвалася настолькі жорсткая клясавая барацьба, настолькі жорсткая барацьба з кулаком. Калі-б не закончылі з хлебазагатоўкамі ў першыя месяцы, хлебазагатоўкі бясспрэчна значна ўскладніліся-б сеў.

Зусім відочна, што і ў гэтым годзе асноўнай задачай павінна быць —закончыць хлебазагатоўчую кампанію ў працягу бліжэйшых некалькіх месяцаў. На гэты раз нам відавочна ўжо ня прыдзецца мець справу з няеср'ем у выкананьне хлебазагатоўчага пляну ў 4-5 месяцаў. Сёлета сялянская маса беднякоў і серадніякоў ужо па другому падыйдзе да гэтай задачы, упэўніўшыся ў правільнасьці такой лініі ў хлебазагатоўках.

Далей, [illegible] асаблівасьцю хлебазагатовак бягучага году будзе, па-першае, тое, што вялікая колькасьць хлеба павінна будзе наступіць ад колгасаў і амаль уся маса хлеба павінна паступіць у плянавым парадку па контрактацыі.

Але было-б разам з тым найвялікшай памылкай думаць, што нам ужо ў гэтым годзе ня прыдзецца сустракацца ні з ніякімі цяжкасьцямі ў выкананьні хлебазагатоўчага пляну. Кулак яшчэ не ліквідаваны і, зразумела, будзе рабіць усё для таго, каб хлебазагатоўчы плян сарваць. Гэта патрэбна ўлічыць, і з самага пачатку, пры намечаны асноў будучай хлебазагатоўчай работы, мець на ўвазе, што посьпех хлебазагатовак залежыць у першую чаргу ад уменьня разгарнуць вялікую політычную кампанію, што і на гэты раз хлебазагатоўкі будуць праходзіць у атмосфэры лютай клясавай барацьбы, у адпаведнасьці з чым мэтады хлебазагатоўчай работы павінны быць у асноўным такімі-ж, як і ў мінулым годзе, а менавіта: рашучае падаўленьне супраціўленьня кулака; шырокае ўцягненьне бядняцкай і серадняцкай грамадзкасьці ў хлебазагатоўчую работу.

— У значнай меры хлебазагатоўчую работу, мы прарабляем ужо цяпер. У гэтым годзе мы паставілі сваёй задачай законтрактаваць усе пасевы. Законтрактаваць хлеб—значыць забясьпечыць наступленьне гэтага хлеба. Колгас, кооператыў, селянін-індывідуальнік, што контрактуе свае пасевы, прымае на сябе абавязацельствы здаць гэты законтрактаваны хлеб у пэўны тэрмін, і калі контрактацыя рэальна, калі здача хлеба ў тэрмін забясьпечана, дык тым самым забясьпечваецца ўжо паступленьне хлеба. Па-гэтаму, такое праведзеньне контрактацыі ў сучасны момант, якое спраўды забясьпечвала паступленьне законтрактаванага хлеба, зьяўляецца нашай задачай.

Контрактацыя праводзіцца с-г. кооперацыяй і ўся маса хлеба павінна паступіць да яе. Тым самым разьвязваецца і пытаньне аб структуры і аб пабудове хлебазагатоўчага апарату. Адзіным загатавальнікам сёлета і павінна быць с-г. кооперацыя, якая ўвесь хлеб законтрактоўвае.

Але распараджаецца хлебам дзяржаўная організацыя — Саюзхлеб. Увесь загатаўляемы хлеб павінен паступіць Саюзхлебу, які разьмяркоўвае хлеб і ўтварае хлебныя рэзервы. Дзеля таго, каб не ўтвараць лішніх складзкіх опэрацый, каб не перакідаць лішні раз хлеб з аднаго складу ў другі, справа організуецца, такім чынам, што пры станцыённых пунктах, на млынох і элеватарах Саюзхлеба, г. зн. у тых пунктах, дзе хлеб ужо павінен паступіць у распараджэньне організацыі, якая разьмяркоўвае загатоўлены кооперацыяй хлеб, здаецца проста Саюзхлебу, на яго склады, ці ў пададзеныя ім вагоны.

Такім чынам, у хлебазагатоўках дзейнічаюць дзьве організацыі: с-г. кооперацыя, якая загатаўляе хлеб, і Саюзхлеб, які разьмяркоўвае хлеб. У гэтых адносінах вялікіх зьмен у параўнаньні з мінулым годам ня будзе. Толькі яшчэ больш скароціцца загатоўчы апарат. Але гэта, зразумела, не азначае, што навокал хлебазагатоўчага апарату ня будзе клопату.

Асноўным недахопам хлебазагатоўчай кампаніі мінулага году было тое, што кооперацыя вельмі мала праяўляла сябе ў хлебазагатоўках. Мясцовыя, параённыя організацыі павінны ўжо цяпер заняцца пытаньнем організацыі хлебазагатовак і ўзмацненьня с.-г. кооперацыі. У бягучым годзе с.-г. кооперацыя будзе адзіным загатавальнікам, і трэба зрабіць так, каб яна з гэтай задачай справілася. Трэба загадзя прагледзець кооперацыйны апарат, загадзя забясьпечваць яго працаўнікамі, якія ведаюць хлебазагатоўчую справу, якія умеюць загатаўляць хлеб загадзя сконцэнтраваць гэтых працаўнікоў і узяць цьвёрды курс на мобілізацыю мас навакол хлебазагатовак.

А. Львоў.

КАГО РЫХТУЕ ЛЕПЕЛЬСКІ БЕЛПЭДТЭХНІКУМ?

У КІРАЎНІЦТВА КОМСАМОЛЬСКАЙ ОРГАНІЗАЦЫІ ТЭХНІКУМУ ПРАЛЕЗЬЛІ КУЛАКІ І ПАДКУЛАЧНІКІ, ЧЛЕНЫ КОНТР-РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ГРУПЫ—„КАМЕНЦЫ“. КОМСАМОЛЬЦЫ ГАНЕБНА ПЛЯТУЦЦА Ў ХВАСЬЦЕ ЧУЖАКОЎ

Патрэбна неадкладнае ўмяшаньне органаў РСІ

Усе тыя, якія па розных прычынах (асабліва па соцыяльнаму становішчу) ня прымаліся ў іншыя тэхнікумы Беларусі, знашлі сабе прытулак у Лепельскім БПТ. Тут сабраліся чужакі з усіх куткоў Беларусі.

Толькі нядаўна адміністрацыя, грамадзкія організацыі тэхнікуму на фактах ідэолёгічных прарываў, на разлажэньні часткі студэнтаў убачылі, што ня ўсё добра, што тэхнікум засьмечаны клясава-варожым нам элемэнтам. Склад студэнцтва ў большасьці: сяляне-серадлякі, саматужнікі і служачыя. Пролетарскі асяродак вусім малеьні. Толькі адзінкамі налічваецца рабочых і батракоў. У групе серадлякоў шмат заможнікаў, былых людзей, сынкоў дзякоў, арандатараў, эканомаў і г. д.

„Каменцы“ дзейнічаюць

Вось чаму да апошняга часу маглі існаваць у сьценах Педтэхнікуму контр-рэволюцыйная група студэнтаў пад назвай „каменцы“ (амаль усе з Каменскага с-с, Лепельскага р-ну).

Гэтыя „каменцы“, пасяліўшыся ў адным пакоі з'організавалі баявыя дружыны пад назвай „БШП“, — бей, што папала, і „КВД“, — куды вецер дзьме. Гэтая група, стаўшы на чале кіраўніцтва студэнцкіх організацый, праводзіла анты-савецкую ізадрыўную разлагаючую работу.

Яшчэ ў мінулым годзе, будучы ў Каменскай сямігодцы, кіраўнікі гэтай групы: комсамолец Курта і заможнік Нарковскі вялі анты-савецкую работу сярод вучняў і насельніцтва. Вывешвалі на хатах сялян антысавецкія лёзунгі: Гэты самы Курта-выключаны комсамольскай ячэйкай на пасаду радактара насьценгазэты «Кузьня Асьветы» —наладжваў у сваіх пакоях і ў інтэрнаце імпровізаваныя мітынгі па абароку лідэраў правага ухілу ў партыі, выкідваючы розныя контр-рэволюцыйныя лёзунгі.

А АПА ячэйкі КСМ — Паўлоўскі—актыўны сябра групы „каменцаў“, які ў сьпісах лічыцца рабочым, а ў сапраўднасьці зьяўляецца сынком контр-рэволюцыйных бацькоў, якія да 1924 г. зьяўляліся буйнымі арандатарамі млыноў, таксама прапаведваў контр-рэволюцыйныя тэорыі.

Група „каменцаў“ пропагандавала, што: „соцыялізм мы пабудаваць не зможам, бо ў людзей неаднолькавыя тэмпэраманты ды клімэтычныя ўмовы дзе яны жывуць. Нам не дагнаць капіталістычныя краіны“.

Вялікая частка студэнтаў: Шорц, Курта, Нарковскі, Марунка, Ліўшыц—актыўна выступалі супроць колектывізацыі і спачувалі кулаку. Студэнтка Ліўшыц нават дагаварылася, што: „лепш выселіць трох студэнтаў, чымся аднаго кулака“.

У самым тэхнікуме зрывалася колектывізацыя быту. Была організавана на першым курсе шэсьць комун, якія нічога не зрабіўшы, распаліся, зараз організавана адна агульная комуна, але за работу яна ня ўзялася.

Разлажэньне сярод студэнтаў дайшло да таго, што яны групамі кралі сшыткі ў кнігарні (Даўнэр, Мароз, Нарковскі, Баршчэўскі і інш.), падраблялі талёны на абеды і проста выцягвалі грошы з кішэні (Бобрык).

Антысэмітызм, беларускі нацыянал-дэмократызм і шовінізм розных колераў мелі асаблівае месца ў тэхнікуме. Студэнт Шастакоў не адзін раз выказваў думку: „Я-б на Беларусі ніводнага селяніна-беларуса не раскулачыў-бы, бо няма ў нас кулакоў“. Студэнты—Басевіч, Беньяжінсон, Шмуклер і Ліўшыц С. абзывалі студэнтаў-беларусоў мужыкамі, складалі ў інтэрнаце сваю яўрэйскую групу, не гулялі і не сябравалі з беларусамі.

Студэнты: Шорц, Курта, Гарашчэня, Мароз і інш. абзывалі яўрэяў-студэнтаў жыдамі, каверкалі яўрэйскі акцэнт і мову, распаўсюджвалі анты-сэміцкія анэкдоты і вершы.

Ударыліся ў пэсымізм.

У тэхнікуме нагляделіся сярод студэнцтва пэсымістычныя, упадніцкія настроі Комсамолец—студэнт Максімаў—стаў піць гарэлку і пісаць сумныя вершы, выліваючы ў іх сваё адзінотва, сум і ням'ер'е ў посьпехі пяцігодкі. Пісалі так:—„трэба ўзяць вялікую лупу і прыставіць да вачэй—тады толькі што-небудзь добрага ўбачым у пяцігодцы, а то ўсё ў адну кучу зьліваецца“.

Хуліганства, ломка электрычных лямпачак, частыя бойкі паміж студэнтамі, нячулыя адносіны адзін да аднаго, разьдзяленьне на „містэраў“ і „хахлоў“—усё гэта гаворыць аб поўным разлажэньні тэхнікуму.

Тэхнікум засьмечаны клясава-чужымі нам элемэнтамі і таму на гэтай „тлустай“ глебе маглі вырасьці букеты разлажэньня і прарываў.

„Махровы букецік“

У тэхнікуме яшчэ дагэтуль вучацца асобы, якія пазбаўлены выбарчых правоў і нават атрымоўваюць стыпэндыю:

Басевіч, бацька якой да 1928 году займаўся гандлярствам. Каб уступіць у колгас і ўстроіць сваіх дзяцей, перадаў крому сваім крэўным. Сама Басевіч трымае сувязь з чужымі нам элемэнтамі, пазбаўленцамі, зьяўляецца ярай шовіністкай.

Вучацца дзьве дачкі бышага панскага эконома Кажаронага, які калісьці лупцаваў сялян, а зараз, „пролетарызаваўшыся“, пралез у колгас. Пад кіраўніцтвам сакратара ячэйкі КСМ Аксяновіча, які „заляцаецца“ да адной з дачок, прыняты нават у комсамол.

Паўлоўскі—сын буйнага арандатара млыноў, абшарніка, актыўны сябра групы „каменцаў“, абаронца не кіраўнікоў, яры правы ўхілісты, да гэтага часу нават быў членам бюро ячэйкі ЛКСМБ.

Ліўшыц Олава—дачка бышага буйнага ўласьніка почты, у якога мелася 16 коняй,—ярая шовіністка.

Харашчэня—сын кулака. Студэнты Мароз і Салюк—сынкі дзякоў. Мацкевіч С.—дачка заможніка, контрабандыстага і эксплёататара. Да часу высяленьня вучыўся і Агрызка, бацька якога раскулачаны і выселены разам з сынам-студэнтам. Таварышы аб іх ведалі, але нічога не гаварылі.



„Махравы букецік“

„Тэорэтыкі“ перавыхаваньня чужака

Яшчэ вучыцца шмат асоб, якія захавалі сваё соцыяльнае паходжаньне, як, напрыклад, студэнты: Качан О., Мурашка, Далейцёнак, Палонскі, дзьве сястры Качан і іншыя. Усе яны ўступалі ў тэхнікум як батракі і бедлякі, а сапраўды зьяўляюцца заможнікамі. Шмат хто з іх састаіць у комсамоле.

У дырэктара тэхнікуму, комсамольскай ячэйкі, студкому склалася такая тэорыя: „Наш тэхнікум малады, знаходзіцца ў асяродзьдзі шостачковага мяшчанства, складаецца з людзей розных куткоў Беларусі і паходжаньняў, дзякуючы такім „об'ектыўным“ умовам мы павінны перавыхаваць нашых студэнтаў“. Гэта тэорыя падхапляецца і студэнцкай масай. Студэнт Кажановіч (сынслужачага) на сходзе выказвае такую думку: „Што вы крычыцё аб самачыстцы? Хіба вы не ведаеце гісторыю рэволюцыі, што нашы правадыры зьяўляюцца выхадцамі з буржуазіі і афіцэршчыны, а ўсё-такі яны перавыхаваліся і ім давяраюць“.

Тэорыя перавыхаваньня чужакоў у тэхнікуме вельмі распаўсюджана. Адсюль, як практычны вынік,—перашкаджаць у самачыстцы, замазваньне хваробных зьявішч, нежаданьне разгортваць самакрытыку для ліквідацыі ўсіх прарываў. Асабліва прымірэнча адносіцца да чужых нам элемэнтаў дырэктар тэхнікуму тав. Ісакоў (выключаны з партыі. Яму падавалася шмат заяў на чужакоў, але ён іх то „губляў“, то забываў“. Але, на сходзе некаторыя студэнты прыпёрлі яго „да сьцяны“, пытаючы: „Дзе заява на дзяцей Кажарскіх („эканома“), чаму іх трымаюць у тэхнікуме?“—тав. Ісакоў адказвае: „Бацькі іх у колгасе. Гэта будзе левым загібам, калі мы іх выключым, як колгасьнікаў, з тэхнікуму. Калі іх бацькоў выключаць з колгасу, тады пабачым і мы“.

Была пададзена заява, што студэнт Манульна быў зьвязаны з кулаком (зараз выселены) і ў час канікуў стаяў на чале групы заможнікаў супроць настаўніка-грамадзяніна Губінскай школы, але і гэты матар'ял дзесьці „загінуў у дырэктара“.

Дзеяньні самога дырэктара

Антысэміт, хуліган, кіраўнік контр-рэволюцыйнай групы, выключаны з комсамолу—Курта, застаўляецца ў тэхнікуме. Калі комсамольская ячэйка хадайнічала перад пэдрадай аб выключэньні з тэхнікуму клясава-чужога нам элемэнта—студэнткі Мацкевіч, дырэктар аж залятаўся. „Гэта бясчынства, што вы ўмешваецеся, гэта наша справа“. І яна, выключаная з комсамолу, застаўляецца ў тэхнікуме.

Ня добра абстаіць справа і з самакрытыкай. Недаўна адбылася бойка паміж студэнтамі Шмуклерамі (шовіністы, разлажыўшыйся сябра групы „каменцаў“) і студкорам Патоцкім.

Актывісты і актыўны студкор Патоцкі выкрыў у насьценгазэце ўсю контр-рэволюцыйную групу „каменцаў“ з прычыны чаго выключылі двух з тэхнікуму; выкрываў на сходах, у газэце хваробныя зьявішчы тэхнікуму. Увесь час „каменцы“, у прыватнасьці Шмуклер, пагражалі яму забойствам, на кожным кроку абсьмейвалі, праследавалі і нарэшце Шмуклер пабіў галаву Патоцкаму.

Студэнцкія сходы, якія зараз-жа былі скліканы па гэтаму пытаньню, не ўразумелі палітычнае важнасьці гнеценьня на студкора клясава-чужымі нам элемэнтамі. Агульны сход кваліфікуе ўчынак Шмуклера і Патоцкага аднача́сова як хуліганства. Скарыстаўшы некаторыя асобныя памылкі Патоцкага (якія ён сам прызнаў), яго прызналі вінаватым у бойцы і далі суровую вымову, а Шмуклера організатара нападу, заставілі ў тэхнікуме.

Комсамольская ячэйка цягнулася ў хвасьце...

Комсамольская ячэйка пляцецца ў хвасьце і позна рэагуе на гэтыя хваробныя зьявішчы. Нерашуча ставіць пытаньне аб іх зьнішчэньні. Немобілізавала масы студэнцтва на зьніштажэньне гэтых груповак і ідэолёгічных вывіхаў. Частка студэнцтва прымірэнча адносілася да усяго гэтага.

Прымаюць сякія-такія організацыйныя захады (за апошні час), калі аб гэтым пачало пагаварваць мяшчанства Лепелю, калі ўсім тэхнікум ража вочы.

Насьценгазэта таксама фіксуе толькі ўжо даўно выкрытыя факты, але не мобілізуе студэнцтва на зьнішчэньне іх, на выкрыцьцё ўсіх прарываў, на разгортваньне самакрытыкі. Лёзунг аб крытыцы, не зважаючы на асобы, насьценгазэтай ня быў падхоплены. Гэта можа падцьвердзіць факт аб замазваньні і прымірэнцтве з боку дырэктара і іншых студэнцкіх кіраўнікоў, аб чым ні разу не друкавалася у газэце.

„Крытыкавалі“, зважаючы на асобы.

Калі асьмеліліся напісаць аб прымірэнстве з боку сакратара ячэйкі Аксяновіча да чужых элемэнтаў, дык насьценгазэта падыходзіць з асьцярожнасьцю: і піша так: Як ні сорамна пісаць пра сакратара нашай комсамольскай ячэйкі, але прыходзіцца“...

Комсамольская ячэйка настолькі зьвіхнулася з правільных клясавых рэек, што прымае ў свае шэрагі клясава-чужых нам студэнтаў, заможнікаў, сыноў гандляроў і г. д., якія зараз павінны быць выгнаны з тэхнікуму.

За ўвесь час існаваньня тэхнікуму ніхто з вышэйшых організацый не зацікавіўся яго работай, ніхто ня цікавілася справаздача дырэктара. Райком КП (б)Б, КСМ, РВК, якія знаходзяцца тут-жа пад бокам, не рэагуюць на прарывы Пэдтэхнікуму.

Патрэбна належнай мятлою выгнаць усю гніль з тэхнікуму. Гора-кіраўнікоў трэба аддаць пад суд за грубое скрыўленьне клясавай лініі. Патрэбна дэтэрмінова прачысьціць комсамольскую ячэйку і выгнаць ў тры шыі з комсамолу галавацепскае кіраўніцтва ячэйкі, якое пляцецца ў хвасьце чужакоў. Патрэбна, каб АК ЛКСМБ неадкладна прыняў меры ў адносінах РК ЛКСМБ, які сваёй політычнай тупасьцю аб'ектыўна садзейнічаў росту антысавецкіх настрояў у тэхнікуме. Кіраўнікоў Райкома і РВК патрэбна прыцягнуць таксама да суровай адказнасьці.

А. Усьмінскі.



Чырвонаармеец абучае комсамольца прыцельваньню

МЕСЯЧНІК „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“

Рабочая моладзь Барысава аб „Ч. З“

Заля Нова-Барысаўскага рабочага клюбу паступова напаўняецца народам. На першай агульна-гарадзкой конфэрэнцыі чытачоў і юнкораў „Чырвонай Зьмены“—даклад рэдакцыі газэты і садаклад РК аб тыражнай працы па Барысаўскім раёне.

Выступаючыя ў спрэчках указвалі, што „Чырвоная Зьмена“ зьяўляецца сапраўдным баявым органам Цэнтральнага Камітэту комсамолу, вядзе рушучую барацьбу з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, мобілізуючы і організуючы моладзь на выкананьне задач, пастаўленых партыяй. Аднак, у газэце да гэтага часу ёсьць нездавальняючыя бакі ў працы. Ня наладзіла кіраўніцтва юнкорамі, ваўсёды бывае па-комсамольску бастай.

У спрэчках указвалі на ... ныя адносіны з боку асобных ... самольскіх колектываў да ... вакол „Чырвонай Зьмены“, у ... ніку чаго на фабрыцы „Раб... газэту выпісваюць тры чалав...

Конфэрэнцыя абвясьціла ўдарнай у справе распаўсюдж... газэты „Чырвоная Зьмена“ і ... вядзеньня месячніку.

Барысаўцы абяцаюць у ча... сячніку распаўсюдзіць 1000 э... ляраў „Чырвонай Зьмены“.

Соня Фрыдлян...

Працуюць з холадком

Ня гледзячы на пастанову ЦК ЛКСМБ аб 100 проц. выпісцы комсамольцамі „Чырвонай Зьмены“, комсамольская ячэйка жонскіх двухгадовых белпэдкурсаў нерашуча праводзіць іх у жыцьцё. З 60 асоб газэту выпісваюць 30—35 асоб. Упаўнаважаны па вярбоўцы бадай што зусім не працуе.

АУР.

***

Ня гледзячы на тое, што АБВШ складаецца з малодняку-комсамольцаў, „Чырвоную Зьмену“ выпісваюць усяго 20 проц. Гэта тлумачыцца тым, што з боку ячэек не праводзіцца ніякай растлумачальнай працы па ... пытаньню. АБВШ, шэфам якой ... зьяўляецца беларускі комсамол, ... хутка выправіць гэты недахоп.

А. Гры...

***

У Шклоўскім Нардоме ... знайці кветкі, добрыя вадзіны, сьцяны вялікае трумо, шахмат... шачныя панэлі, а „Чырвонай Зь... з агнём не знойдзеш. Нардом ... вае шмат моладзі. Яна не мае ... масьці чытаць сваю газэту.

Аюдзь...

Рагачоўцы, чакаем адказу!

Агульна-гарадзкі сход комсамолу Жлобіншчыны аб'явіў сябе ўдарным па выкананьню кантрольных лічбаў ЦК ЛКСМБ і распаўсюджваньню „Чырвонай Зьмены“ на працягу месячніку „Чырвонай Зьмены“.

Сход выклікае на соцспаборніцтва рагачоўскую комсамольскую організацыю, аднача́сова заключае па... між кожнай ячэйкай, кожным комсамольцам дагаво... на выкананьне гэтай задачы.

Манкевіч.

Выклікаем

Комсамольская ячэйка курсаў па падрыхтоўцы ў ВНУ пры Мсьціслаўскім пэдтэхнікуме абвяшчае сябе ўдарнай па распаўсюджваньню газэты „Чырвоная Зьмена“, бярэ на сябе абавязкі: усім комсамольцам выпісаць „Чырвоную Зьмену“ і распаўсюдзіць ня ... як 50 экзэмпляраў сярод ... тыйнай моладзі.

Комсамольская організацыя ... клікае курсы па падрыхто... ВНУ пры рагачоўскім пэдтэх...

Бюро ячэ...

Выехала экскурсія „Чырвонай Зьмены“

Учора, а 7 гадзіне раніцы, з Менску выехала экскурсія, організаваная газэтай „Чырвоная Зьмена“ па маршруту Гомель—Кіеў—Днепрабуд. Колькасьць экскурсантаў 150 чал., большая частка з іх—рабочыя.

У склад экскурсіі ўваходзіць ... ларускі тэатр рабочай мола... экскурсіяй паехаў спэцыяль... рэспондэнт нашай газэты. На ... экскурсіі штаб з наступных ... рышоў: Самуціна, Азарожка ... рытановіча.

Папраўка.

У № 111 за 15 мая г. г. у зьмешчаным дакладзе нам. старшыні Дзяржплану БССР т. Гольдштэйна аб кадрах на 5-й калёнцы ў пятым абзацы, на 4-м радку напісана: „Падрыхтоўваць патрэбна вялікую колькасьць кваліфікаваных кадраў праз ФЗВ“, трэба чытаць: „Падрыхтоўваць патрэбна вялікую колькасьць кваліфікаваных кадраў пераважна праз ФЗВ“. У ... абзацы гэтай-жа калёнкі напі... „Мы прымушаны, таварышы, ... чы да другіх мэтадаў падрых... тым ліку і да ЦІП'у, трэба ... —„Мы прымушаны, таварышы, ... бегчы і да другіх мэтадаў падр... кі, у тым ліку і да ЦІП'у“.

Адказны рэдактар—Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599